Государственное учреждение образования
«Средняя школа №1 г. Лиды»
Информационно-библиотечный центр



# Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына….

***Да 140-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы***

Лида
2022

**Змест**

Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына
*(Скарочаная біяграфія Я.Купалы)*______________________ 3

Цікавыя факты з жыцця Я.Купалы______________________ 6

Прапануемае мерапрыемства па творчасці Я. Купалы _____8

**Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына….**

*Скарочаная біяграфія Я. Купалы*

У гісторыі кожнага народа ёсць паэтычнае імя, якое з’яўляецца яго неафіцыйным сімвалам, якое першае ўсплывае ў памяці і першым называ-ецца, калі заходзіць гаворка пра гэты народ.

Купала… Гэта імя даравана нам Богам, каб пра беларускі народ ведалі ва ўсім свеце.

Паэт быў і застаецца адной з яркіх вяршынь беларускай літаратурнай спадчыны. Цікавасць да яго асобы і творчасці застаецца стабільна высокай як у нашай краіне, так і за мяжой, як у людзей старэйшага ўзросту, так і ў моладзі.Нарадзіўся будучы паэт у фальварку Вязынка Мінскага павету Мінскай губерніі (цяпер – Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). Янка Купала – літаратурны псеўданім Івана Дамінікавіча Луцэвіча, які быў падказаны яму ўласнай датай нараджэння – 25 чэрвеня (7 ліпеня). Менавіта ў гэты дзень беларусы адзначаюць авеянае легендамі старажытнае свята Купалле.

Пачатак літаратурнай дзейнасці Янкі Купалы звязаны з публікацыяй у 1905 г. у мінскай газеце “Северо-западный край” верша “Мужык”.

У 1908 г. у Санкт-Пецярбургу ў выдавецтве “Загляне сонца і ў наша аконца” выйшаў першы зборнік твораў паэта “Жалейка”, дзе быў змешчаны верш “А хто там ідзе?”, які адразу набыў статус нацыянальнага гімна. Зборнік з энтузіязмам быў успрыняты беларускай грамадскасцю.

Першае 10-годдзе творчай дзейнасці Янкі Купалы стала вызначальным для яго самасцвярджэння як нацыянальнага песняра, выразніка дум і пачуццяў беларускага народа. Гэты перыяд жыцця і творчасці паэта быў цесна звязаны з Вільняй і Санкт-Пецярбургам.

1908

У 1908 – 1909 гг. Янка Купала жыве ў Вільні, працуе ў рэдакцыі газеты “Наша Ніва” і прыватнай бібіліятэцы Барыса Даніловіча “Веды”, з кастрычніка 1913 г. (пасля паўторнага прыезду) – у “Беларускім выдавецкім таварыстве”, а з сакавіка 1914 г. па жнівень 1915 г. займае пасаду рэдактара-выдаўца “Нашай Нівы”.

Янка Купала адразу ўключаецца ў агульную з нашаніўцамі працу па беларускім адраджэнні. Акрэсліваецца адна з цэнтральных тэм усёй яго творчасці – тэма Бацькаўшчыны, станаўлення дзяржаўнасці Беларусі, якая займае свой “пачэсны пасад між народамі”. У Вільні напісаны многія творы паэта, якія ўвайшлі ў залаты фонд класічнай спадчыны, а “Наша Ніва” данесла Купалавы вершы ў самыя глухія куткі Беларусі і за яе межы. Менавіта са старонак гэтай газеты паэт атрымаў магчымасць “з цэлым народам гутарку весці”.

У снежні 1909 г. па запрашэнні прафесара Браніслава Эпімах-Шыпілы Янка Купала пераязджае ў Санкт-Пецярбург, дзе жыве звыш трох гадоў. Тут малады паэт працуе на Казённым вінзаводзе № 3, у Публічнай бібліятэцы, наведвае заняткі вячэрніх агульнаадукацыйных курсаў Аляксандра Чарняева, прымае ўдзел у рабоце Беларускага навукова-літаратурнага гуртка студэнтаў Санкт-Пецярбургскага імператарскага ўніверсітэта. І вельмі шмат піша, асабліва, калі летам прыязджае да матулі на Лагойшчыну, у Акопы.

Менавіта ў гэтыя гады ў Санкт-Пецярбургу напісана паэма “Курган”, выдадзены зборнікі “Гусляр” (1910) і “Шляхам жыцця” (1913), асобнымі выданнямі ўбачылі свет драматычныя паэмы “Адвечная песня” (1910) і “Сон на кургане” (1912). У Акопах з’явіліся паэмы “Бандароўна”, “Магіла льва”, “Яна і Я”, “Гарыслава” (незавершаная), п’есы “Паўлінка”, “Раскіданае гняздо”, “Прымакі”, вялікая колькасць вершаў.

У пачатку 1916 г. Янка Купала быў мабілізаваны ў армію. Служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін у Полацку.

1916

У канцы 1917 г. пераехаў у Смаленск, дзе працаваў агентам па забеспячэнні ў харчовым камітэце Заходняй вобласці. Гэта быў асабліва складаны перыяд у жыцці паэта-грамадзяніна, бо яго хвалявала, а ці будзе мець Беларусь незалежнасць, дзяржаўнасць. Другое паэтычнае дыханне прыйшло да Купалы вясной 1918 г. Пасля працяглага перапынку.

Янка Купала загаварыў са сваім народам магутнай мовай паэзіі: з’явіліся такія знакамітыя творы Песняра, як “Спадчына”, “Свайму народу”, “У дарозе”, “На сход!”, “Паязджане”, “Мая вера”, “Паўстань” і інш., што склалі змест зборніка “Спадчына”.

У студзені 1919 г. Янка Купала пераехаў у Мінск. Як паэт і публіцыст актыўна выступаў у прэсе (газетах “Звон”, “Беларусь”, “Вольны сцяг”, “Савецкая Беларусь”, часопісе “Рунь”). З 1921 г. удзельнічаў у грамадскім, культурным і навуковым жыцці краіны, у тым ліку ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Інстытута беларускай культуры, рэспубліканскіх выдавецтваў, нацыянальнага тэатра.

У гэты перыяд – перыяд вырашэння пытання дзяржаўнасці Беларусі – Купала ўзвысіўся як выразнік народна-дэмакратычных ідэй, пясняр маладой Беларусі, лідэр беларускага адраджэння.

Публіцыстыка Купалы пачатку 20-х гг. XX ст. утрымлівае асноўныя ідэйныя палажэнні, закладзеныя ў падмурак фарміравання беларускай дзяржаўнасці. Палымяныя, смелыя, адметныя сваім стылем і складам артыкулы Купалы былі перапоўнены адной ідэяй: Беларусь павінна быць незалежнай! Ён сцвярджаў: “Толькі адна поўная дзяржаўная незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу”.

1925

Падчас Вялікай Айчыннай вайны паэт жыве ў Маскве і Падмаскоўі, потым у Пячышчах каля Казані. Нягледзячы на дрэнны стан здароўя, ён не спыняе актыўнай грамадскай і літаратурнай дзейнасці: народны Песняр становіцца на чале духоўнага супраціўлення фашысцкай агрэсіі, якая хацела пазбавіць беларускі народ самага дарагога – Бацькаўшчыны. Янка Купала піша палымяныя звароты да насельніцтва акупаваных раёнаў, да партызанаў.

Усяляе веру ў перамогу над крыважэрным ворагам, “Гітлерам ашалелым”.

Янка Купала горача верыў у перамогу свайго народа. Але пабачыць родную Беларусь, вызваленай ад чужынцаў, яму не было наканавана. 28 чэрвеня 1942 г. першы народны паэт Беларусі Янка Купала трагічна загінуў, упаўшы з лесвічнай пляцоўкі дзевятага паверха гасцініцы “Масква”. Пахавалі яго 1 ліпеня 1942 г. на Ваганькаўскіх могілках у Маскве, а праз дваццаць гадоў прах паэта быў перавезены на радзіму і пахаваны на Вайсковых могілках у Мінску.

**Цікавыя факты з жыцця Я.Купалы**

6 ліпеня споўнілася 140 гадоў з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. У школьных падручніках вы бачылі яго псеўданім шмат разоў і, напэўна, не раз блыталі з Якубам Коласам. Спадзяюся, гэтыя 10 фактаў дапамогуць па-іншаму, з чалавечага, а не вучнёўскага пункту гледжання ўбачыць гэту асобу.

- Яго продкі служылі Радзівілам. На гербе сям'і Луцэвічаў была намалявана адрубленая нага ў памяць пра прашчура, які засунуў яе ў сіло, каб выратаваць караля. За гэта яго зрабілі шляхцічам. Вось толькі праз стагоддзі дакументы згубіліся, і падчас разбору шляхты Луцэвічы былі пераведзены ў саслоўе мяшчан. Колькі не імкнуліся адваяваць права на зямлю, не атрымалася. Таму драма "Раскіданае гняздо" часткова аўтабіяграфічная.

- Рэальныя падставы мела і знакамітая п'еса "Паўлінка". Кожны герой твора меў прататып. Паўлінка — дзяўчына з Пецербурга, якая падабалася паэту, астатнія — жыхары Акопаў. Калі яны пабачылі камедыю, пазналі сябе і некаторыя пакрыўдзіліся да такой ступені, што нават не віталіся з Іванам Дамінікавічам. Сюжэт Янка Купала ўзяў з жыцця бацькоў, якія ажаніліся тайна і ўцяклі з дому.

- Назва першага зборніка "Жалейка" таксама невыпадковая. У дзяцінстве хлопчык жадаў навучыцца музыцы, таму замовіў у газеце жалейку. Яе даслалі па пошце, а малы Іванка заплаціў вялікія для яго сям'і грошы. Праз тры дні інструмент расклеіўся, бо быў зроблены з паперы. Луцэвіч так абразіўся несправядлівасцю, што кнігу ўласных вершаў назваў у памяць пра той выпадак.

-Дарэчы, першы зборнік мог і не выйсці. Фундатар Аляксандр Ярэміч доўгі час думаў, якому творцу аддаць грошы. Паміж Сяргеем Ясеніным і Янкам Купалам выбраў апошняга і не прагадаў.

- Вершы Івана Луцэвіча натхнілі Гагарына. Маці першага касманаўта ўзгадвала, што, прачытаўшы "Хлопчык і лётчык", маленькі Юра адразу пажадаў стаць падобным да героя твора. І, як вы ведеце, гэта дзіцячая мара споўнілася .

- Простыя людзі вельмі любілі паэта. Ён быў народным не толькі паводле дзяржаўнай ўзнагароды, але і паводле стаўлення аднавяскоўцаў. Яшчэ

пры жыцці на акно яго лецішча жыхары Ляўкоў штодзень прыносілі кветкі. Так яны выказвалі павагу Янку Купале.

- Пісьменнік умеў прадказваць надвор’е. У гэтым дапамагала таполя, што расла каля дома ў Мінску. Перад паводкай яна рыпела, бо камель назапашваў ваду. Чуючы характэрны гук, Янка Купала тэрмінова перавозіў сям’ю  на лецішча. За гэту рысу мастак слова называў дрэва “мой вартавы”.

-Літаратар збіраў каменьчыкі. З любой паездкі прывозіў не сувеніры, а камяні, прычым самыя звычайныя. Памятаў, адкуль кожны з іх. Любіў перабіраць, бо гэта супакайвала. А часам Іван Дамінікавіч рассыпаў іх перад крэслам і проста глядзеў, уяўляючы, што адпачывае на моры. Менавіта так і называў паэт сваю калекцыю — “маё маленькае мора”. З часам гэта стала модна ў мінскім асяродку інтэлігентаў. Напрыклад, дома ў Петруся Броўкі можна пабачыць такую ж калекцыю.

-Янка Купала выдатна гуляў у шахматы і заўсёды перамагаў Якуба Коласа ў гэтым спорце. Апошні штораз злаваўся і нават выходзіў з дому, каб супакоіцца. Гэта не перашкаджала класікам беларускай літаратуры сябраваць. Шмат пра іх адносіны можа сказаць фраза Івана Луцэвіча “Каласочак, мне так добра з табой маўчыцца”.

## Прапануемае мерапрыемства па творчасці Я. Купалы

*Песняры зямлі беларускай*

*Літаратурна-музычная кампазіцыя, прысвечаная 140-годдзю з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа*

*(для вучняў пачатковых класаў)*

Афармленне залы: выстава літаратуры; мультымедыйная прэзентацыя (словы аб жыццёвым шляху песняроў суправаджаюцца адпаведнымі слайдамі; у час гучання песень дэманструюцца слайды беларускіх краявідаў; словы аб ушанаванні памяці пісьменнікаў суправаджаюцца слайдамі, на якіх адлюстраваны помнікі песнярам, плошча, парк, музеі, якія носяць іх імёны і інш.)

(Гучыць песня “Спадчына”, сл. Янкі Купалы, муз. Ігара Лучанка)

1-ы чытальнік:
Чытаць вершы Купалы і Коласа –
Найвялікшае свята.
Хай яно ўрачыста і молада
Увойдзе ў кожную хату.

2-і чытальнік:
Хай для ўсіх загучыць па-новаму,
Узнясецца высока
Беларускае слова кроўнае
Нашых слынных прарокаў.

3-і чытальнік:
Бо яны нас вучылі, радзілі,
Як людзьмі называцца.
Аб пачэсным сказалі пасадзе
Беларускае нацыі.

4-ы чытальнік:
І каб мы свой куточак родны
Не забылі ніколі,
Продкаў славілі моц і годнасць
І імкненне да волі.

5-ы чытальнік:

Прачытайце радок чароўны –
І сябе вы не расчаруеце:
Праз паэзіі свет цудоўны
Вы духоўную моц адчуеце.

Бібліятэкар: Наш народ з гонарам можа прыгадаць імёны многіх пісьменнікаў, якія выказвалі думы і спадзяванні, мары і надзеі беларусаў у розныя часы. І першымі ў гэтым спісе стаяць імёны Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Менавіта яны, як ніхто іншы, прама і адкрыта выказвалі права беларусаў на вольнае жыццё, развіццё сваёй мовы і культуры.

Праз творы беларускіх песняроў народ расказаў свету пра сваё жыццё, прыроднае хараство роднага краю, характар, традыцыі і звычаі і такім чынам пацвердзіў сваё існаванне на зямлі.

Сапраўднае імя Янкі Купалы – Іван Дамінікавіч Луцэвіч. Нарадзіўся ён 7 ліпеня 1882 года ў самым цэнтры Беларусі, пад Мінскам, у фальварку Вязынка (зараз Маладзечанскі раён Мінскай вобласці). Здарылася гэта амаль на свята Івана Купалы. Пазней, калі паэту, паводле літаратурнай традыцыі, спатрэбіўся псеўданім, ён выбраў гэты – Янка Купала.

Да нашага часу жыве ў славян легенда пра тое, што ў самую кароткую летнюю ноч, у ноч на Івана Купалу, зацвітае на імгненне кветка папараці. Хто яе знойдзе, той знойдзе і сваё шчасце.

6-ы чытальнік: (чытае верш Я.Купалы “На Купалле”)

(Гучыць беларуская народная песня “Купалінка”. Выходзяць дзяўчаты ў вянках. Яны выконваюць карагодны танец)

Бібліятэкар. А колькі розных гульняў праводзілася на Купалле! Давайце і мы з вамі пазабаўляемся. Для гульні спатрэбяцца 6 хлопчыкаў і 5 дзяўчынак. Станьце, калі ласка, у карагод. Пакуль гучыць музыка, вы будзеце танцаваць. А калі яна скончыцца, кожны хлопчык павінен выбраць сабе дзяўчынку.

(Праводзіцца гульня. Хлопчык, які застаўся без пары, адварочваецца. У гэты час вядучы хавае “папараць-кветку” так, каб усе, акрамя гэтага хлопчыка бачылі, дзе яна схавана.)

Бібліятэкар (звяртаецца да хлопчыка, які застаўся без пары). Зараз ты, хлопча, будзеш шукаць папараць-кветку, але не ў лесе, а сярод нас. Чым бліжэй ты будзеш падыходзіць да месца, дзе яна схавана, тым мацней дзецi будуць пляскаць у далоні. Гэта дапаможа знайсці кветку.

(Працягваецца гульня)

Бібліятэкар. Беларусам пашчасціла, бо менавіта на нашай зямлі нарадзіўся і вырас звычайны хлопчык Янка Луцэвіч, якога свет ведае і памятае як Янку Купалу, народнага паэта Беларусі.

Рос Янка хлопчыкам дапытлівым і ўражлівым, ахвочым да навукі. Кожны дзень адкрываў хлопчыку новыя тайны, і так хацелася хутчэй спасцігнуць іх!

7-ы чытальнік. (Зачытвае ўрывак з новай кнігі Уладзіміра Ліпскага “Янкаў вянок”:

“...Паслухаем успаміны сястры паэта Леакадзіі Дамінікаўны Раманоўскай: Ясь не меў часу чытаць удзень, бо трэба было працаваць на гаспадарцы. Чытаў увечары і ўночы.Чытаў пры лямпе, пры лучыне, на начлезе пры вогнішчы. Сядзе, бывала, вечарам за кнігу, а яго пачынаюць гнаць спаць.

- Кідай сваё чытанне. Няма чаго вачэй сляпіць і дарэмна газу паліць.

Патушаць лямпу, а ён запаліць лучыну, прыладзіцца і чытае. У святочныя дні, улетку, ён зранку браў кнігу і на цэлы дзень сыходзіўу лес. Кніжцы ён аддаваў кожную вольную хвіліну.Што б ні рабіў, заўсёды пры сабе меў кніжку.”

Бібліятэкар. Янка рана пачаў задумвацца, чаму ў адных усяго ўдосталь, а яго бацька ніяк не можа назбіраць грошай, каб купіць зямлі, з цяжкасцю знаходзіць грошы на тое, каб сын пайшоў у школу.

Складаным і няпростым было жыццё хлопчыка. А ён радаваўся жыццю, любіў Радіму, шанаваў родную мову і захапляўся ёю.

(Інсцэніруецца ўрывак з верша Я. Купалы “Сын і маці”)

Сын.
- Мамка, мамка, нам сягоння
Гаманілі ў школе
Аб якойсці Беларусі
Што жыве на волі.

Хоць я слухаў вельмі шчыра
(Не люблю іначай),
Ды ніяк не мог уцяміць,
Што ўсё гэта знача.
Маці.
- А вось тое, мае дзеткі,
Глянь-зірні наўкола:
Бачыш гэтыя сялібы,
Хаткі нашых сёлаў;

Бачыш логі, сенажаці,
А на іх – крыніцы,
Далей – бор зялёны, гонкі,
Што ўвысь глядзіцца?

А там далей, дзе ўжо вока
Дасягнуць не можа,
Тое самае пабачыш, -
А ўсё так прыгожа!

Сотні вёсак і мястэчак,
Гарадоў нямала,
Рэк бурлівых, пушч гамонкіх
З неапетай хвалай.

Во ўсё гэта, мае дзеткі,
Ад межаў да межаў
Беларусяю завецца
Й да цябе належа.
Сын.
- А! Ужо сцяміў! Дык багат я,
Меўшы столькі цудаў:
Гэткім чынам я ніколі
Служкаў не буду.

Ну, а йшчэ скажы мне, мамка,
Бо я не разважыў:
Што такое беларусы,
Як настаўнік кажа?
Маці.

- Ах, які ты йшчэ дурненькі,
Каб не скеміць гэта!
Ну, паслухай: усе людзі,
Што ад лета ў лета,

Ад пакон вякоў жылі тут
І жывуць сягоння...
... Дык жа ўцям: на Беларусі
Жывуць беларусы!
Сын.
- Вось яно што! Праўда, мамка,
Ужо сабе ўтлумачыў:
Беларус я! Ох, дам пытлю,
Хто скажа іначай.
Ну, але яшчэ не ўсё тут
Ясным мне здаецца:
Што такое беларускай
Гутаркай завецца?
Маці.
- Ой, дурненькая варона,
Што з табой чыніці!
Як жа йначай беларусы
Могуць гаманіці?
Як жа мы з табой гуторым
Вось у гэту хвілю?
Як жа я пяю над зыбкай
Для малой Марылі?

Як бабуля баіць казкі
Аб нядолі-долі;
Як начлежнікі спяваюць
На начлезе ў полі?!
Сын.
- Ну, ужо знаю, знаю, мамка!
Як у люстры бачу,
Пакажу я ўсяму свету,
Хто я, дый што значу!

Бібліятэкар. Некаторыя вершы Янкі Купалы пакладзены на музыку і сталі песнямі. Зараз прагучыць адна з іх. Словы Я.Купалы, музыка Юрыя Семянякі. “Явар і каліна”

(Гучыць песня)
Дзеці! А можа хто з вас ведае вершы Янкі Купалы і хоча нам расказаць.
(Дзеці расказваюць вершы)
А зараз, перш, чым мы пачнём гаворку пра Якуба Коласа, давайце пагуляем яшчэ ў адну гульню.

(Дзеці гуляюць у беларускую народную гульню "Іванька і Марылька")
З гурта выбіраюцца хлопчык і дзяўчынка (Іванька і Марылька). Удзельнікі ўтвараюць круг, у цэнтры якога знаходзяцца Іванька і Марылька з завязанымі вачыма. Па камандзе Іванька павінен злавіць Марыльку, увесь час пытаючыся: "Марылька, дзе ты?". А Марылька адказвае: "Тут я Іванька, тут". Калі Іванька зловіць Марыльку, выбіраецца новая пара, і гульня паўтараецца.

Бібліятэкар. Якуб Колас нарадзіўся 3 лістапада 1882 года ў сям'і лесніка ў засценку Акінчыцы, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына (цяпер Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Сапраўднае яго імя – Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч.

З маленства ён разам з бацькамі пераязджаў з адной леснічоўкі ў другую, мяняючы абжытую мясцовасць на неабжытую глухамань. З тых пор у душу Костуся запала пачуццё спачування і любві да пакрыўджаных і абяздоленых людзей працы.
8-ы чытальнік. (чытае ўрывак з кнігі С. Аляксандровіча "На шырокі прастор")
"Мужчыны прыехалі з кірмашу прыцемкам.

У леснічоўцы іх даўно чакалі. Хлопцы ведалі, што ні бацька, ні дзяцька Антось з Нясвіжа без гасцінца не прыедуць, і каторы раз выбягалі на ганак паслухаць, ці не грукочуць калёсы.

Кастусю асабліва не цярпелася. Бацька абяцаў прывезці яму сёння кнігу з вялікімі літарамі і малюнкамі.

Як толькі на падворку заляскаталі драбіны, хлопцы мігам скаціліся з печы і рынуліся з дзверы. Неўзабаве Уладзік тарабаніў у хату вясло абаранкаў, Алесь вязанку тараноў, а Косцік нёс, прыціскаючы да грудзей, буквар.

У той вечар для Косціка, апрача кнігі, нічога не было на свеце. Уладзік з Алесем і малая Міхаліна завіхаліся каля абаранкаў, а ён як сеў каля комінка, дзе гарэла газоўка, так і не мог адарвацца ад кнігі...

"Цікава, што тут напісана...", - думаў хлапчук, гартаючы буквар...

Так у Кастуся з'явіліся свае клопаты – што б там ні стала навучыцца чытаць! Ён увесь дзень не разлучаўся з кнігай. Клаўся спаць – кніга была пад падушкай. Гнаў каровы ў поле – браў з сабою ў торбачку...”
Бібліятэкар. Вось бачыце, якія падобныя былі ў дзяцінстве Колас і Купала – ахвочыя да навукі. А зараз паслухайце верш, у якім Якуб Колас звяртаецца да вас, дзеці.
9-ы чытальнік. (чытае верш Я. Коласа “За навуку”)

Заціхаюць гоні і даліны,
Павучкі наткалі павуціны
Ды развесілі на сонцы
Свае белыя красёнцы.

Ходзіць вецер полем з сумным спевам,
Дзе жытцо рунее новым севам.
Адышло ад нас ты, лета,
Жаўталісцем лес адзеты.

Кончыліся, дзеці, вашы гульні
Каля светлай рэчкі, каля пуні,
І на жоўценькім пясочку,
І ў зялёненькім лясочку.

Пахавайце вуды, стрэлы, лукі,
Прыступіце, дзеці, да навукі,
Каб было ўсё акуратна,
Каб вучыцца на “выдатна”.

Дык павучымся ж мы зіму шчыра;
Вясна вернецца, а з ёю – вырай,
Зноў мы слаўна пагуляем,
Свежых ягад назбіраем.

Жыццё ў лясной глухамані давала магчымасць уражліваму хлопчыку адчуць чароўную красу беларускіх краявідаў. Гэтыя дзіцячыя ўражанні ляглі ў аснову многіх вершаў паэта, прысвечаных непаўторнай прыгажосці прыроды Беларусі.

10-ы чытальнік. (чытае верш Я.Коласа “О, край родны, край прыгожы!”)

О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,

Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць;
Гэтых гмахаў безгранічных
Балатоў тваіх, азёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць?

Асобныя вершы паэта пакладзены на музыку. Паслухайце песню “Мой родны кут”, музыку да якой напісаў кампазітар Ігар Лучанок.

(Гучыць песня)

(Дзеці чытаюць вершы Якуба Коласа)

Бібліятэкар. Беларусы берагуць і шануюць спадчыну сваіх песняроў, народных паэтаў Беларусі. У Мінску ёсць бронзавы помнік Якубу Коласу на плошчы, якая носіць яго імя. Паэт на гэту плошчу “прыйшоў не адзін, а разам з героямі сваіх твораў. Помнік Янку Купале ў Мінску знаходзіцца ў скверы, які носіць імя гэтага знакамітага майстра слова.

У сталіцы і на радзіме песняроў створаны музеі, якія захоўваюць каштоўныя архіўныя матэрыялы, асабістыя рэчы паэтаў.

А зараз я хачу вызначыць самага ўважлівага ўдзельніка сённяшняй сустрэчы. У гэтым нам дапаможа віктарына.

Пытанні:

1. У якім годзе нарадзіўся Янка Купала?
2. Калі нарадзіўся Якуб Колас?
3. Дзе нарадзіўся Янка Купала?
4. Дзе знаходзіцца радзіма Якуба Коласа?
5. Якія творы Янкі Купалы вы ведаеце?
6. Якія казкі Якуба Коласа вы чыталі?

7. Назавіце сапраўднае імя Янкі Купалы.

8. Назавіце сапраўднае імя Якуба Коласа.

9. Якія песні на словы Янкі Купалы і Якуба Коласа вы ведаеце?

10. У гонар якога пісьменніка ў Мінску названа плошча?

11. Імя якога песняра носіць імя парк у Мінску?

(Найбольш актыўныя ўдзельнікі віктарыны ўзнагароджваюцца кнігамі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Усе прысутныя знаёмяцца з выставай кніг паэтаў.)